


ВЫБАР

ГАЗЕТА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПЛЫНЯЎ ПРЫДЗВІНСКА-ПРЫДНЯПРОЎСКАГА КРАЮ

№ 21 (49) 7—13 ліпеня 1993 г. Цана 3 рублі

Лёнік Тарасэвіч у Віцебску

Па прыватнаму запрашэньню ў сярэдзіне чэрвеня горад наведаў вядомы беларускі мастак зь Беласточчыны Лёнік Тарасэвіч. Ён агледзеў Стары горад, пабываў у майстэрнях віцебскіх мастакоў Алеся Пушкіна, Галіны і Васіля Васільевых.

Інтэрвію з мастаком чытайце ў адным з наступных нумароў «Выбара».

М. ПАЎЛАЎ.



Фота А. Лакатко.

Тут пачынаўся шлях...

На Ушаччыне, адкуль пачынаўся творчы шлях Пятруся Броўкі, Еўдакіі Лось, Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Сяргея Законнікава, у гадавіну вызвалення краю ад фашысцкіх захопнікаў абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў ды аддзел культуры аблвыканкама зладзілі традыцыйнае абласное свята паэзіі.

Два дні тут гасцявалі, выступалі на літаратурных і музычных імпрэзах у раённым доме культуры і на радзіме Броўкі—у Пуцілкавічах—паэты Марыя Баравік, Вера Бародзіч, Тамара Барадзёнак, Галіна Варатынская, Навум Гальпяровіч, Ірына Дарафейчук, Алесь Жыгуноў, Анатоль Канапелька, Яўгенія Мальчэўская, Алег Салтук, Святлана Якубоўская, празаікі Ірына Жарнасек ды Герман Кірылаў.

М. ВАЛАЧОБНІК.

Мо і назва не беларуская!

На нарадзе ў гарвыканкаме прадстаўніца гандлёвага аддзелу ўпікнула МП «Купальле» і ягоную краму па вул. Гогаля, 14, што, маўляў, адсутнічаюць на прылаўках беларускія тавары, адны польска-маскоўскія шмоткі. Цікава, якая ж з віцебскіх крамаў прадае кніжак і сувеніраў зь беларускай сімволікай болей, чым «Купальле»? Ці можа кераміка «Купальля» для гандлёвага адзьдзелу небеларускі тавар, гэтак, як і беларускія кніжкі?

М. ЦЮПАТКА.

НА 6-ЦІ СТАРОНКАХ:

ЗАЯВА

выканаўчага камітэта Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады «Аб становішчы ў краіне»

Прайшло больш за тры месяцы, калі пракамуністычныя, праімперскія сілы на Беларусі адкрыта пацвердзілі, што яны па-ранейшаму кіруюць дзяржавай. Гэта адбылося, калі да так званага «Народнага руху Беларусі», куды ўваходзілі ПКБ, КПБ, фракцыя «Саюз» Вярхоўнага Савета, Славянскі сабор, Саюз афіцэраў і іншыя арганізацыі, далучылася праўрадавае дэпутацкае аб'яднанне «Беларусь» Вярхоўнага Савета. Такім чынам, «Народны рух Беларусі» стаў кантраляваць урад, большасць у Вярхоўным Савеце, чым і засведчыў сябе кіруючай сілай на Беларусі.

Што ж дало канчатковае вяртанне камуністаў да ўлады ў складзе камуністычна-наменклатурнага, праімперскага блоку! Можа, вярнуліся танная калбаса і цукар! Не. Але за гэтыя тры месяцы адбылося далучэнне да небяспечнага ваеннага саюзу з ваюючымі краінамі Сярэдняй Азіі і Закаўказзя. У войску пачалося вынішчэнне парасткаў дэмакратыі і дзяржаўнага патрыятызму. І нарэшце, мы атрымалі рэзкае павышэнне цэнаў пры пустых паліцах у крамах і рэальную пагрозу энергетычнага крызісу.

Дэпутацкая большасць у Вярхоўным Савеце разам з урадам замест таго, каб займацца рэформамі, з надзеяй чакалі—калі ж нарэшце ў Расіі «чырвона-карычневыя» экстрэмісты здолеюць дабіцца адстаўкі Прэзідэнта Ельцына і можна будзе пакінуць усё без зменаў. Але яны дачакаліся эканамічнага краху, і цяпер не ведаюць, што рабіць. Кіраваць па-старому ўжо нельга, па-новаму яны не ўмеюць, а галоўнае, што правячай наменклатуры ўжо не патрэбен былы сацыялізм і яшчэ не патрэбна цывілізаваная рынкавая эканоміка. Яе цалкам задавальняе становішча, калі ў мутнай вадзе безгаспадарчасці і беспакаранасці можна лавіць «вялікую рыбу», каб будаваць шыкоўныя асабнякі і купляць «Мерседэсы». Да якога стану такое «рыбалоўства» даводзіць эканоміку, можна пераканацца па цэнніках у крамах.

Выканаўчы камітэт БСДГ лічыць, што наменклатурны, пракамуністычны ўрад наказаў сваю няздольнасць кіраваць краінай у сучасных умовах і павінен пайсці ў адстаўку, пакуль правячая наменклатура не паспела дашчэнту разбурыць нашу эканоміку і поўнасцю завяршыць «прыхватызацыю» дзяржаўнай маёмасці. Кіраванне краінай павінна быць перададзена кааліцыйнаму ўраду народнага даверу. БСДГ таксама патрабуе неадкладнага правядзення рэферэндуму аб даверы Вярхоўнаму Савету і датэрміновых выбарах. БСДГ заклікае ўсе здаровыя сілы грамадства да каардынацыі намаганняў, каб прымусіць сысці з палітычнай арэны тых, хто, чапляючыся за ўладу, з кожным днём усё больш цягне нас у бездань эканамічнай катастрофы і анархіі.

У новым рэчышчы

Частка дэлегатаў Першага з'езда беларусаў свету наведала Полацк, пабывала з экскурсіяй у Астроўна, пабачыла стары Віцебск. У будынку Акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа віцебская грамадскасць сустрэлася з удзельнікамі з'езду.

Гэтае традыцыйнае ўжо (бо трэці год запар) спатканне з беларускімі эмігрантамі прайшло ў крыху новым рэчышчы. Сёлета геаграфічныя рамкі пасунуліся—апроч частых на Віцебшчыне гасцей з Канады і ЗША прыехалі й аўстралійцы. Не чуліся і набіўшыя аскоміну пытанні тыпу «А як вы там жывяце?».

Беларусы замежжа з болем гаварылі пра вынішчэнне беларушчыны на Бацькаўшчыне, аб маруднай адбудове незалежнай дэмакратычнай краіны Беларускай.

Н. ПРЫСУТНЫ.

«Падарунак» да з'езда беларусаў свету

У 600 разоў павысіўся за апошнія гады кошт авіялістоў за мяжу. З 1 ліпеня ён узляцеў з 101 да 301 рубля. Канешне ж, выраслі цэны і на іншыя паштовыя адпраўленні за граніцу.

Наш кар.

Апетыты растуць

Напэўна, працоўным ВА «Даламіт» ды і шырокай грамадскасці Рубы яшчэ невядома, але гэта факт. Калі ў лютым не выдалі аванс рабочым прадпрыемства, дык набылі «Волгу», «РАФ», а потым і ГАЗ-69. А калі ў красавіку не было авансу, дык набылі ўсяго «Форд». Аднак то дробязь, ёсць у запасе яшчэ 6 мільярдаў крэдыту. Трымайцеся, капіталісты! Мы і Вас купім.

Ігнат ВАСІЛЕЎСКІ.

І адзін у полі воін

Сябра Віцебскай гарадской арганізацыі АДПБ І. Глазуноў распачаў збор подпісаў у падтрымку пазіцыі С. Шушкевіча, які выказаўся за нейтральную парламенцкую Рэспубліку Беларусь.

Ю. С.

Прыватызавалі вуліцу!

У грамадскую камісію па кантролю за раскрадальніцкай дзейнасцю апарата паступіла паведамленне, што з парушэннямі заканадаўства ў вёсцы Шаркі, якая адносіцца да калгаса-камбіната «Звязда» Віцебскага раёна, набыта ў прыватную ўласнасць 6 калгасных дамоў з надворнымі будынкамі—цэлая вуліца. З мэтай высветліць законнасць здзелкі прадстаўнікі камісіі звярнуліся да намесніка старшыні калгаса М. Рубашкі, аднак той чамусьці адмовіўся паказаць дакументы, што датычацца продажу калгасных дамоў.

Таму грамадская камісія і рэдакцыя газеты «Выбар» звяртаюцца ў інспекцыю Кантрольнай палаты з просьбай праясніць узнікшыя пытанні. Хто канкрэтна набыў дамы, калі і па якой цане? Ці ёсць якія-небудзь дакументы на гэты конт? Спадзяёмся, што чытачы атрымаюць адказы на пытанні.

Грамадская камісія па кантролю за раскрадальніцкай дзейнасцю дзяржапарату працягвае сваю работу. Яе тэлефоны: **37-28-44, 37-35-06.**



Палеміка

АД РЭДАКЦЫІ «ВЫБАРА»:

У № 3 нашай газеты быў змешчаны артыкул В. Каралёва з Мёрскага р-на «Асцярожна: камунізм». Пасля таго, як у мёрскай раённай газеце «Сцяг працы» быў надрукаваны скарочаны варыянт гэтага артыкула, на старонках «СП» разгарнулася палеміка. Свае водгукі змясцілі П. Гушчын і С. Масла, які, у прыватнасці, стаў на бок аўтара артыкула і выказаў рэзкую крытыку поглядаў П. Гушчына.

Паколькі П. Гушчын публічна задаў В. Каралёву шэраг пытанняў і ў нейкай ступені закрануў чалавечую годнасць аўтара, апошні палічыў неабходным адказаць апаненту гэтак жа публічна праз раённую газету. Але ў рэдакцыі «СП» атрымаў адказ, што па незалежачых ад рэдакцыі прычынах надрукаванне яго матэрыяла «Камунізм! А навошта!» зараз не мэтазгодна.

У гэтым выпадку рэдакцыя «Выбара» лічыць неабходным надрукаваць прыклад камуністычнай «палемікі» разам з адказам на яго В. Каралёва дзеля таго хаця б, каб гэты матэрыял дайшоў да землякоў аўтара праз нашу газету, якая распаўсюджваецца і ў Мёрскім раёне.

Мае права на жыццё

Гэта, уласна кажучы, мой адказ на артыкул «Камунізм. Пытанні застаюцца», які быў апублікаваны ў газеце «Сцяг працы» за 2 лютага гэтага года. Па заяве аўтара артыкула ён гатовы выслухаць любыя пярэчанні й аргументы. Думаю, што ў мяне ёсць такія аргументы дый факты. Па-першае, ваш артыкул з пачатку ў да канца з'яўляецца злобным і наўмысным паклёпам на камуністычныю ідэю і камуністычную партыю як носьбітку гэтае ідэі. Мне як чалавеку, які мае партыйны стаж 53 гады, які чытаў і вывучаў гісторыю сваёй партыі, вядома, што яна ніколі не абвяшчала ў сваіх праграмах дыктатуру партыі. Яна абвясціла дыктатуру рабочага класа, чалавека працы і заўсёды старалася яго абараніць. Ды ў гэтым і была неабходнасць.

Паважаны аўтар, а вы не заўважаеце зараз дыктатуры, прычым дыктатуры жорсткай: тэрора, гвалту, сваволля, рабавання, падману. І дыктуе гэтае ўсё сёння злачынны свет. Цяпер чалавек працы пакрыўджаны і прыніжаны, яго няма на экранах тэлевізараў, у перыядычных выданнях. Вы калі-небудзь думалі пра чалавека, што вырошчвае хлеб і корміць вас? Як жыве гэты чалавек, вы ведаеце? А камуністы знalі і сягоння знаюць.

Вы пішыце, што партыя эксплуатавала працу рабочых і сялян, за кошт чаго будавала сабе раскошныя дамы, санаторыі, дачы. Гэта не зусім верна. Партыя заўсёды змагалася і, упэўнены, надалей будзе змагацца з класам эксплуататараў. Будаўніцтва вялося толькі за кошт партыйнага бюджэта, за кошт тых складак, каторыя многія камуністы выплочвалі. Я гэтае раблю ўсе 53 гады.

Прыкладам гэтаму можа служыць будаўніцтва ў Мёрах. За сродкі партыйнага бюджэту за ўвесь час існавання раённай партыйнай арганізацыі пабудаваны гмах райкама партыі й 28 кватэр, большасць з якіх заселена настаўнікамі, лекарамі, працаўнікамі адміністрацыйных органаў і сельскай гаспадаркі, пенсіянерамі.

Паважаны рэдактар, вы таксама жывяце ў кватэры, што пабудавана на партыйныя сродкі. Дарэчы, я вам хачу нагадаць, шаноўны аўтар, што рэдактар і намеснік рэдактара раённай газеты «Сцяг працы» атрымалі другую вышэйшую адукацыю таксама за кошт партыі.

Вы вельмі асцярожна ды сціпла кажаце пра нашыя дасягненні пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Я не ведаю, чаму гэта так. Хочацца з вамі сустрэцца, пагаварыць і даведацца, дзе і якую вы атрымалі адукацыю, колькі вы асабіста за гэта заплацілі? І яшчэ: дзе вы чыталі аб'яву, у каторай было б напісана, што некамсамольцы ў інстытут не прымаюцца. Вы параўноўваеце памеры заработнай платы рабочых у нас і ў капіталістычных краінах. Але чаму вы не прыгадваеце іншыя варункі, не гаворыце аб прадукцыйнасці працы й іншых фактарах, якія ўплываюць на заробак?

Вы спрабуеце нас выхаваць пры дапамозе амерыканскіх гісторыкаў і французскіх эканамістаў. Мне проста шкада, што вы забылі ўсё айчыннае або не ведаеце яго ўвогуле. Я хачу напомніць і спытаць: хто першым стварыў штучны спадарожнік Зямлі, хто першым пабываў у космасе? Можна прывозіць іншыя дадзеныя аб дасягненнях нашай навукі.

Я ні ў якім выпадку не абараняю адмоўныя моманты ў жыцці партыі. Хутчэй за ўсё гэта ейная трагедыя.

Саму камуністычную ідэю кампраметавалі не аднойчы, у тым ліку й кіраўнічыя работнікі партыі. Яны займаліся не толькі парушэннем партыйнай дысцыпліны, але станавіліся крымінальнымі злачынцамі. Аднак такіх жа адзінкі і гісторыя іх заўсёды называла, спадзяюся, і цяпер назаве. Дык чаму ж павінны несці адказнасць 19 мільёнаў камуністаў, у тым ліку і я? Я глыбока перакананы мудрасцю свайго жыцця ў тым, што камуністычная ідэя мае права на жыццё, бо яна справядлівая і гуманная. У чарговы раз яе мусяць бараніць новыя сілы, у яе шэрагі павінны ўліцца чэсныя, справядлівыя і прыстойныя людзі. Гэтая партыя мусіць быць без чынашанавання і ўдзельных князёў, без разбухлага бюракратычнага апарату, а партыя адзінадумцаў, людзей, якія жадаюць зрабіць штосьці лепшае, якія турбуюцца пра жыццё чалавека працы.

Што ж датычыцца такіх асобаў, як былы Генеральны сакратар КПСС Гарбачоў, то гэта—авантурыст і здраднік справы партыі й народа. Яму падобны Ельцын і Краўчук, каторых выгадавала партыя, а яны потым ёй здрадзілі. Страшней, чым здрада, у чалавечым жыцці няма нічога.

П. ГУШЧЫН,
інвалід вайны, камуніст з 1940 года, ветэран працы.

КАМУНІЗМ? А НАВОШТА?

З вялікім задавальненнем прачытаў водгук Пятра Ісакавіча Гушчына («СП», 27 лютага 1993 г.) на мой артыкул «Камунізм. Пытанні застаюцца». Меркаваў, на старонках газеты разгарнецца сур'ёзная і аргументаваная палеміка па пытаннях, закранутых у маім артыкуле, але яшчэ раз упэўніўся, што мясцовыя адэпты камунізму проста няздольныя на штосьці больш грунтоўнае, чым элементарныя партагіткі ці «творы» ў духу палітычных даносаў ленінска-сталінскіх часоў, перапоўненыя лаянкай, асабістымі нападкамі і неабгрунтаванымі папрокамі ў бок асмеліўшыхся мець свой пункт гледжання і вольна выказваць яго.

І ўсё ж паколькі шаноўны П. Гушчын у сваім лісце публічна задае мне шэраг пытанняў, большасць з якіх чамусьці аніяк не стасуецца да ўзнятых у маім артыкуле праблем, лічу неабходным адказаць яму.

Па-першае, аб «дыктатуры пралетарыяту». Мне цалкам зразумела, чаму паважаны апанент за свой доўгі век так і не зразумеў, што партыйнае кіраўніцтва, найбольш прывілеяваныя камуністы часцей за ўсё гаварылі адно, рабілі другое, а асабіста для сябе заўсёды мелі на ўвазе трэцяе. Не бачыць, не чуць, не разумець сапраўднае становішча рэчаў раней было бяспечна і прыбыткова, а цяпер прызнацца ў гэтым няёмка. А гэта ж пры Вас, шаноўны, знішчалі «першыя Саветы» (у 1939—41 г.г.) нашу моладзь у Беразвеччы, гналі старых ды малых на згубу ў Сібір, рабавалі сялянскія сядзібы, абкладалі невыноснымі падаткамі і пастаўкамі, ганялі «ў план». Для ўсіх вас яны былі «ворагамі», бо жылі і думалі інакш, чым было пажадана вам. Я добра разумею Вашу «мудрасць жыцця», якая дапамагала Вам ужо пасля Другой сусветнай вайны «не бачыць», як у Сібір гналі разам з сем'ямі гэткіх жа ветэранаў і інвалідаў, як Вы самі, за тое, што яны ваявалі на Заходнім фронце, а жыць і працаваць імкнуліся на роднай зямельцы. Яна ж Вам дапамагала дзесяцігоддзямі не бачыць і таго, што «салдаты арміі Андэрса» пазбаўлены пашаны ды ільгот, якімі карысталіся Вы. Зразумела, што «не бачылі» Вы і ўцёкаў тысяч нашых вяскоўцаў у Латвію, на лесанарыхтоўкі, у Данбас, якія ратаваліся такім чынам ад галечы і беспрасветнасці «першых калгасаў».

А гэта ж пры вашай, камуністычнай, сістэме адзінай вартасцю чалавека лічылася яго партыйнасць, з'явіўся ў нас клас «непатапляльных» бюракратаў, якія падобна стракозам пералятаюць з аднаго кабінета ў іншы, якім усё роўна было кім і чым камандаваць, абы было сытна і спакойна самім. Гэта пры вашай сістэме было магчыма, напрыклад, вясковага настаўніка, сапраўднага інтэлігента і прыстойнага чалавека, зацягнуць у партыю, «высунуць» старшынёй калгаса (вось партыйная кадравая палітыка ў дзеянні!), а калі аказаўся праз меру самастойным і няздольным да халуйства, давесці да вар'яцтва і самагубства. Або якую-небудзь сакратарку, што завочна атрымала дыплом педінстытута і ні аднаго дня не адпрацавала ў школе, не мае вопыту і ўяўлення аб спецыфіцы гэтай працы, адразу «ўзнесці» да інструктара або нават загадчыцы РАНА, бо яна ж—партыйная. Падобнымі прыкладамі поўніцца гісторыя камуністычнай дыктатуры. Таму я не бачу вялікага сэнсу ў тэрміналагічнай казуістыцы наконт «дыктатуры пралетарыяту». **Таталітарная па сваёй сутнасці сістэма захоўвае антынародныя рысы і пад самай «салодзенькай» назвай.**

Што да дыктатуры злачыннага свету, якую з такім красамоўствам апісвае аўтар водгука. Прашу Вас, спадар Гушчын, не трубавацца, бо добра ведаю, што пры выпадку ў камуністаў заўсёды знойдзецца «сацыяльна блізкі» ім злачынец-памагаты, згодны на любую правакацыю, на любое паскудства па загаду сваіх гаспадароў. У гэтым плане я ўжо папярэджаны добразычліўцамі, якіх пасля выхаду майго артыкула аказалася надзіва шмат у нашым раёне. Акрамя таго, маю такі-сякі асабісты вопыт дый «Архіпелаг ГУЛАГ» А. Салжаніцына з'яўляецца, па сутнасці, маёй настольнай кнігай, якую, між іншым, вельмі раю ўдумліва вывучыць і спадару Гушчыну. Але ўжо той факт, што самы небяспечны і вялікі палітычна-мафіёзны кангламерат сусветнага маштабу нарэшце рассыпаўся, настройвае мяне як і большасць свядомых людзей на аптымістычны лад.

Цяпер аб інстытутах і камсамольцах. Ах, ах, якая наіўнасць, якая святая прастата! І дзе я гэта бачыў аб'яву, што шлях у інстытут некамсамольцам закрыты? А «ў краіне, дзе так вольна дыхаў чалавек» многа чаго тварылася без аб'яў і гучных паведамленняў! Абавязковыя ў школьных характарыстыках паведамленні аб членстве ў ВЛКСМ, аб палітычнай дабранадзейнасці, завераныя подпісам сакратара камітэта камсамола, гэта, што, дзеля красамоўства рабілася? Пры тагачаснай усеагульнай палітычнай зацкаванасці адсутнасць слоў аб палітычнай паслухмянасці для сотняў і тысяч абітурыентаў, што, праходзіла безвынікова?

Катэгарычна не згодзен з меркаваннем Пятра Ісакавіча, быццам бы я «забыў усё айчыннае, або не ведаю яго ўвогуле». Даводжу да Вашага ведама, шаноўны спадар Гушчын, што ў поўным варыянце артыкула (у раёнцы быў прапанаваны скарочаны), змешчаным у сёлетнім № 3 газеты «Выбар», я карыстаюся вытрымкамі не толькі з прац «амерыканскіх гісторыкаў і французскіх эканамістаў», але таксама патрыярха сусветнай сацыялагічнай навукі Піцірыма Сарокіна (вядомага і паважаемага ва ўсім свеце, толькі чамусьці не ў нас), рускага публіцыста М. Устралава і нават (ну проста неверагодна!) так палымяна любімага Вамі У. Леніна. Больш таго, вымушан Вам заўважыць, што надрукаваныя за апошні час больш тузіна маіх публікацый у рэспубліканскім і мясцовым друку толькі па тэмах гісторыі і краязнаўства не даюць аніякай падставы публічна абвінавачваць мяне ў нацыянальным нігілізме, але і ў гэтым выпадку дазваляюць абвінаваціць Вас у беспардоннай хлусні. Акрамя таго, лічу патрэбным паведаміць Вам асабіста, што як і кожнага вясковага жыхара, мяне корміць перш за ўсё родная зямелька і ўласная гаспадарка. Але я добра разумею Вашы сентэнцыі наконт кармлення адных другімі і Вашага адмоўнага ведання сапраўднага вясковага жыцця. Толькі вось чамусьці ад іх патыхае сацыяльнай дэмагогіяй.

Што датычыцца Вашага «чытання і вывучэння» гісторыі кампартыі, а таксама адукацыі, то павінен адказаць, што тут у Вас яскрава высвеціліся камуністычная фанабэрыя, аб недапушчэнні якой папярэджваў сваіх паслядоўнікаў ці не сам Ленін.

За дзесяцігоддзі камуністычнай дыктатуры, «дзякуючы» ўзмоцненай ідэалагічнай апрацоўцы насельніцтва, стварылася ілжывае меркаванне быццам аб надзённых пытаннях сучаснасці і гісторыі, аб ролі камуністычнай ідэі і камуністычнага руху ў развіцці грамадства маюць права разважаць толькі пэўныя афіцыйныя і паўафіцыйныя асобы, маючыя за плячыма легітымацыю партапарата, «партыйную адукацыю» ці як мінімум «чытаўшыя і вывучаўшыя гісторыю сваёй партыі», а іншыя меркаванні і погляды лічыліся «апакрыфічнымі» і шалёна вынішчаліся разам з іх носьбітамі. Я рад, калі хоць у нейкай ступені паспрыяў разбурэнню гэтага стэрэатыпу. Гісторыю кампартыі, якую шаноўны апанент «чытаў і вывучаў», я маю аж у трох экземплярах 1945, 1951 і 1969 гадоў выдання і асмелюся запэўніць: па меры неабходнасці ў сваёй працы карыстаюся гэтымі «светачамі ведаў». Адукацыю атрымаў сярэднюю-савецкую. Першую—будаўнічую спецыяльнасць асвоіў на вытворчасці, апроч таго з адзнакай скончыў ПТВ. Мне пашчасціла, што атрымаў неблагую, як на сённяшні час, хатнюю адукацыю, за што вельмі ўдзячны сваім родным. У публіцыстычнай працы карыстаюся невялікім асабістым архівам і фамільнай бібліятэкай на трох мовах.

А цяпер аб галоўным. Самай небяспечнай (наўрад ці міжвольнай) Вашай памылкай, спадар Гушчын, з'яўляецца імкненне атаясамліваць такія розныя паняцці, як Радзіма, народ, дзяржава, КПСС.

Да прыкладу, з гэткім жа самым поспехам, як Вы дасягненнямі кампартыі лічыце першы запуск штучнага спадарожніка Зямлі і г. д., сучасныя прыхільнікі нацызму ў Германіі могуць ганарыцца, што менавіта НСРПГ (якая да ўлады прыйшла, між іншым, дэмакратычным шляхам у адрозненне ад РСДРП і іншых кампартый) змагла мабілізаваць нямецкі народ на дасягненне небывалых вышыняў у цяжкай, хімічнай, электратэхнічнай прамысловасці, ядзернай фізіцы, ракетабудаванні і г. д., ліквідавала ў Нямеччыне эканамічны хаос, беспрацоўе, тлумачачы ўсе жахі нацызму «адмоўнымі момантамі ў жыцці партыі», справакаванымі «кампраментуючымі» нацыянал-сацыялісцкую ідэю «асобнымі» (ці не тымі, якіх судзілі ў Нюрнбергу?) кіраўнікамі, якія «займаліся не толькі парушэннем партыйнай дысцыпліны, але станавіліся крымінальнымі злачынцамі».

Асноўнай тэмай майго матэрыяла быў разгляд рысаў камуністычнай палітычнай сістэмы і спроба паказаць, да чаго прывядзе адраджэнне яе. Як бачна з Вашага водгука, спадар Гушчын, Вы не толькі не знайшлі важкіх контраргументаў, але не ўбачылі ці не пажадалі ўбачыць нават самага «зерня», пераве́ўшы палеміку на ўзровень суседскай сваркі. Я разумею, што ў традыцыі бульварных камуністычных «публіцыстаў» галоўнае месца адвесці прыватным бязглуздым прычэпкам, ахайванню асобы апанента, а таксама паталагічнае імкненне абавязкова папаласкаць чужую бялізну. Але, мяркую, час гэткай «палемікі» беззваротна мінае.

Прыкра, што за Вашым баявым і працоўным аўтарытэтам хаваюцца замшэласць, няздольнасць мясцовых адэптаў утапічнай ідэі камунізму асэнсавана выказваць і абгрунтавана абараняць свае погляды. Гэта вельмі сімптаматычна. Вось чаму пры ўсёй павазе да Вашых баявых і працоўных заслуг павінен сказаць, што Вы мяне не пераканалі і больш таго яшчэ больш упэўнілі ў праваце маіх думак.

В. КАРАЛЁЎ.

P. S. Як вядома, у партыях, што грунтуюцца на дэмакратычным падмурку, у партыях парламенцкага тыпу дазваляецца не толькі існаванне асобных думак па пэўных пытаннях (фракцыі), але нават і вольны выхад з партыі.

Затое ў бандыцкіх шайках адыход ад злачыннай дзейнасці (завязка) лічыцца здрадніцтвам і нават (успомнім фільм «Каліна чырвоная») ставіць пад пагрозу само жыццё адышоўшага ад злачыннай дзейнасці. Лямантуючы аб «здрадніцтве» Гарбачова, Ельцына і Краўчука «справе партыі», спадар Гушчын, сам таго не жадаючы, паказвае сапраўдны твар кампартыі.

Рэклама-тэст

У фірмовай краме малдоўскага віна «Кодру» па вул. Праўды, 33, што дэкляруе кругласутачна багаты асартымент і па самых нізкіх цэнах, 25 чэрвеня а 18 гадзіне было: чырвонае сталовае віно «Мугурэл» 0,75 л па 290 рублёў і араматызаванае віно «Паляна». Вось і ўвесь асартымент. Цэны яшчэ нічога сабе.

Аматар малдоўскага чырвонага віна.

Бясплатная стаянка

Пасьпяхова дзейнічае новая кругласутачная аўтастаянка па вул. Шубіна, 2. За прыгожай мастацкай агароджай Трынітарскага касьцёлу (цяпер Сьвята-Пакроўскі катэдральны сабор) утульна пачуваюць сябе шыкоўныя «Мэрсэдэсы», «Опэлі», «Волгі» нашых новых духоўных айцоў. **Хрысьціянін.**

Марк ШАГАЛ: «Гэта-ж мая любімая Беларусь...»



Вянчанне.

Галіна Русак працуе бібліятэкаркай у адзьдзеле мастацтва ў Рудгэрскім унівэрсытэце, зьяўляецца аўтаркай шматлікіх артыкулаў па гісторыі мастацтва, а таксама мастачкай. У Менску экспанавалася выстава яе твораў.

Галіна РУСАК

МАРК ШАГАЛ— УРАДЖЭНЕЦ БЕЛАРУСІ

«Мой сумны й вясёлы горад! Калі я быў маленькім, я назіраў за табою з парога, па-дзіцячаму. Вачам дзіцяці ты здаваўся сьветлым. Калі на маім шляху быў мур, я залазіў не невысокі слуп. Калі й у гэтым выпадку я не мог бачыць цябе, я залазіў затым на дах. Чаму ж не? Мой дзед залазіў туды таксама. Тут я мог назіраць цябе ў сваё задавальненьне. Тут на Пакроўскай вуліцы я другі раз нарадзіўся.»

Марк ШАГАЛ.

У ліпені 1992 г. горад Віцебск прысьвяціў свайму роднаму сыну Марку Шагалу помнік, музей і ўшанаваў зьдзяйсьненьні мастака пры ўдзеле замежных навукоўцаў, паэтаў і журналістаў.

Шагал зьяўляецца міжнародна прызнаным мастаком, чыя творчасьць належыць усяму сьвету. Ён жыў у многіх дзяржавах і засвоіў матывы розных культураў у сваёй мастацай мове. Яго творчы сьветагляд і дух сфарміраваліся, аднак, ва ўражвальныя гады ягонага дзяцінства. Любоў Шагала да Віцебска пацьвярджаецца ў кожнай навуковай публікацыі, прысьвечанай яго жыцьцю і мастацтву. Цытуюцца словы самога Шагала, які сьцьвярджаў: «Я ніколі не забуду, дзе я нарадзіўся». І Вэрнэр Гафтман, дырэктар Нацыянальнай галерэі ў Бэрліне, казаў пра творчасьць Шагала: «Цягам усяго жыцьця ў Парыжы, насуперак сваёй любові да гэтага горада, Шагал адчуваў настальгію па Віцебску. Ягоная фантазія поўнілася малюнкамі яго дзяцінства, якія ў ягонай памяці ператвараліся ў рэальнасьць паэтычных летуценьняў». Расейскі навуковец А. Шацкіх зьвяртае ўвагу на тое, што Парыж узьнікаў у творчасьці Шагала пэрыядычна, тады як Віцебск прысутнічаў заўжды.

Сапраўды, гэта віцебская вуліца, віцебскія дамы—ружовыя, шэрыя і блакітныя, віцебская карова, певень і дом; віцебскія сяляне, цэрквы й сынагогі; віцебскае неба, рака Дзьвіна, віцебскія колеры—вось што складае тэму творчасьці Шагала. Менавіта тут мастак ператварыў рэальнасьць штодзённага жыцьця ў магічную мэтафару духа. Навуковы сьвет пагаджаецца ў тым, які горад меў плённы ўплыў на творчую манеру Шагала. Гэта быў Віцебск.

Навуковы сьвет таксама прызнае той факт, што габрэй Марк Шагал на працягу

(Заканчэнне на 4-й стар.).



Віцебск. Чыгуначная станцыя.

Давід Сімановіч

Пусть Шагал нас объединит

Что ему поклоненья, дары,
Запоздалые наши признанья?
Он открыл такие миры
среди вечного мирозданья!

Это космос красок—Шагал,
красоты и добра криница!..
Если б только он увидал,
что на родине милой
творится,

Как хотят по частям
растащить
его память, его наследье
и к нему причастными быть
все на свете—и те, и эти...

Осторожней, не надо лезть,
если пошлость с души
не смыта.
не нужны ему ложь и лесть..
Пусть Шагаловская орбита

будет чистой—ему лететь
над Покровской
и над Двиною,
презирая подлость и смерть,
торжествуя над силою злою.

И в годину бед и обид
и воинственных
конфронтаций
пусть Шагал нас объединит,
чтоб могли мы к нему
подняться!

Пусть стоит на земле музей,
Дом-музей—светло
и знакомо,
без излишеств и без затей,
как в родительском было
доме,

где и лампы неяркий венец,
и свеча зажжена в субботу,
и у Бога снова отец
просит счастья семье
и народу...

Пусть бы каждый здесь
увидал
то, что сердцем можно
увидеть...
Жил Шагал! И живет Шагал!
И ему благодарен Витебск.

20.2.1993.

Сустрэча з Маркам Шагалам

Вера Рамук нарадзілася ў Глыбокім, але з 1949 года жыве ў ЗША. У Чыкага—з 1964 года. Разам з мужам, Вітаўтам Рамуком, вядзе актыўную грамадскую дзейнасць, наладжваючы беларускія імпрэзы і выставы ў Амерыцы, прапагандуючы беларускую нацыянальную ідэю і духоўную спадчыну Беларусі. З'яўляецца старшынёй Беларускага каардынацыйнага камітэта ЗША.

Спадзяюся, што яе ўспаміны пра сустрэчу з Маркам Шагалам будуць сёння надзвычай цікавыя беларускаму чытачу.

Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ, г. Чыкага.

Быў гэта год 1974. Сталася гэта не спадзявана і не прадбачана. У Чыкага тады гатаваліся да адкрыцьця мазаікі Марка Шагала на пляцы Першага Нацыянальнага Банку. Марка Шагала рэклямавалі тут як ураджэнца Віцебска ў Расеі. Гэта вельмі абурыла нас—амэрыканцаў, што нарадзіліся ў Беларусі.

Беларускі Каардынацыйны Камітэт у Чыкага (Ільіной) пад маім кіраўніцтвам пачаў акцыю спраставання фальшывых вестак аб Марку Шагалу. Ліст, які інфармаваў аб сапраўдным месцы нараджэньня, быў прыгатаваны мною і пэрсанальна даручаны на тэлевізійныя станцыі, радыё і ў газэты. Адна з тэлевізійных станцыяў, прачытаўшы мой ліст, папярэдзіла мяне, што мэр гораду прыгатаўляе праклямацыю ў сувязі з адкрыцьцём мазаікі і што ў праклямацыі Марк Шагал будзе запісаны, што ён родам з Расеі. Дырэктар праграмаў параіў мне ехаць у Гарадзкую Управу як найхутчэй і паведаміць мэра Рычарда Дэйлі, што Марк Шагал родам з Віцебску ў Беларусі.

Калі я прыехала ў Сыты Тол (Гарадзкую Управу), на калідоры напаткала палкоўніка Джэка Райлы, дырэктара імпрэзаў у горадзе Чыкага. Я добра яго ведала з выставак, якія ладзіліся мэрам Дэйлі кожнага году, пачынаючы з 1959-га. Ён адразу пацікавіўся, у якой справе я прыйшла ў Сыты Тол. Калі я яму сказала, што ў справе Шагала і яго прыналежнасьці да Беларусі, дык ён спачатку зьдзіўлена заявіў: «А што за розьніца?». А я адказала яму так: «Кожная птушка мае сваё гняздо, а гэтым гняздом для Марка Шагала была Беларусь, не Расея. А калі-б Марк Шагал нарадзіўся ў Ірляндыі (палкоўнік Джэк Райлы як і мэр Рычард Дэйлі былі амэрыканцамі ірляндзкага паходжаньня), а яго запісалі з Англіі, ці Вы не пратэставалі-б?». Крыху падумаўшы, ён папрасіў пачакаць, і накіраваўся ў бюро мэра паглядзець, ці праклямацыя ўжо падпісана. Калі палкоўнік Райлы вярнуўся, то паведаміў мне, што праклямацыя яшчэ не падпісана і, што мэр згадзіўся ўнясьці папраўку.

Вечарам, калі я вярнулася да хаты, зазваніў тэлефон. К майму вялікаму зьдзіўленьню, гэта быў заступнік прэзыдэнта 1-га Нацыянальнага банку. Ён паведамляў, што даведаўся ад мэра Дэйлі, што Марк Шагал ня ёсьць расейцам, а паходзіць з Беларусі. Ён запрасіў мяне і другіх беларусаў прыйсьці на прэс-канфэрэнцыю, што адбудзецца на заўтра, 26-га верасьня ў аўдыторыі банку, ды адначасна і на адсланеньне мазаікі. Я падзякавала яму за ўвагу і абяцала ўзяць удел ува ўсім.

Канфэрэнцыя пачалася пасьля абеду. Прысутным паведамілі, што Марк Шагал сам ня зможа быць і, што яго будзе заступаць і адказваць на пытаньні яго жонка, сп-ня Вава Шагал, ды што палавіна пятай пасьля абеду Шагал будзе ехаць на банкет і хто мае жаданьне, можа тады пабачыць яго, бо ягоная лімузына затрымаецца каля банку на некалькі хвілін.

У часе канфэрэнцыі я паставіла пытаньне сп-ні Шагал: скуль паходзіць Марк Шагал? Яна заявіла перад усімі прысутнымі, што з Беларусі. Калі канфэрэнцыя закончылася, дык усе ўдзельнікі яе былі запрошаны на агляд мазаікі, што мела быць дэдыкавана на заўтра раніцой. Тут мне была нагода бліжэй пазнаёміцца са сп-няй Вавай Шагал. Гэта перадусім мудрая, сьціплая і вельмі сымпатычная жанчына. Мне прышлося шмат з ёй гутарыць. Аб мазаіцы яна сказала так: «Гэта ўсё, што Вы тут бачыце, прадстаўляе радзімую Беларусь Марка».

А 4.30 мы накіраваліся на ходнік перад мазаікай, пакрытай трампалінай. Неўзабаве затрымалася чорная лімузына і з яе выйшаў старэйшы чалавек (Шагал) і паднясеньнем рукі ў гору, прывітаўся з публікай, жадаючай пабачыць яго. Я выцягнула з тарэбкі паштоўку з партрэтам Марка Шагала, якая прадстаўляла Рабіна з Віцебска, ды кажу яму: «Спадар Шагал, я з Беларусі і хацела-б мець Ваш аўтограф». Яго вочы загарэліся як сільныя сонечныя праменьні дый кажа мне: «Гэта-ж мая любімая Беларусь таксама» і бярэ паштоўку ды падпісвае яе і аддае назад. Пасьля гэтага ён бярэ Ваву за руку, сядаюць у лімузыну ды едуць на прызначаны банкет для іх.

Дэдыкацыя адбылася 27-га верасьня ў 11.30 перад абедам. На плошчы банку сабралася 10-цітысячная грамада. Нам таксама было прызначана месца з прывітальнымі плякатамі па-беларуску і ангельску—«Вітаем нашага земляка Марка Шагала з Віцебску, Беларусі». Праграма трывала гадзіну часу—прамовы, музычныя і харавыя выступленьні, паданьне ўзнаньня для Шагала. Пасьля паўгадзіннага перапынку адбылося прыняцьце для запрошаных гасьцей—музычнага, артыстычнага, мастацкага, літаратурнага і палітычнага сьвету ды дыпляматаў-консуляў з іх сем'ямі ды іншых асабістасьцяў: у тым ліку і прадстаўнікоў ад Беларусі ў асобах Вітаўта і Веры Рамукоў.

Усё, што ладзілася ў сувязі з адсланеньнем мазаікі, было вельмі ўзрушаючым для нас. Марк Шагал—гэта вялікі Божы чалавек.

Яшчэ два мастацкія творы Шагала былі адслонены ў Чыкага пазьней—15-га травеня 1977 г. «Вокны ў чэсць 200-годзьдзя Амэрыкі» ў інстытуце мастацтваў і габэлен, прадстаўляючы жыцьцё і цярпеньні Ева, у інстытуце Рэгабілітацыі 20-га чэрвеня 1986 г., гэты апошні—ужо пасьля сьмерці Марка Шагала.

Вера РАМУК, г. Чыкага.

МАРК ШАГАЛ — УРАДЖЭНЕЦ БЕЛАРУСІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

ўсяго свайго жыцьця аддаваў належнае спадчыне свайго народа. Пры царскім рэжыме жыцьцё габрэйскага народа было нялёгкім. Царская Расея ўстанавіла мяжу аседласьці—мур, за які габрэйскі народ ня мог перасяліцца. Праз мастацтва Шагал пазьбег царскіх забаронаў. Ён скарыстаў свае мастацкія здольнасьці: даў свабоду сваім улюбёным рэчам, дазволіўшы ім лунаць над дахамі ў задуманых ім узаемаадносінах. Для таго, каб жыць і вучыцца ў Санкт-Пецярбургу (за мяжой аседласьці), Шагалу прыйшлося прыбегнуць да маскіроўкі: калі ён паехаў у Санкт-Пецярбург навучыцца жывапісу, то вымушаны быў выдаваць сябе за слугу ў доме адваката, каб абыйсьці абмежаваньні для габрэяў на пражываньне.

Насуперак установленым фактам, якія тычацца мейсца нараджэньня Шагала, працягваецца блытаніна, якая будзе ўвекавечаная ў навуковых працах, адносна краіны, дзе нарадзіўся мастак. Рэч у тым, што «яўрэйская мяжа» знаходзілася ў межах Беларусі, дзе жыло 15 млн. чалавек, якая была падпарадкаваная імпэрыялістычнаму расейскаму рэжыму. Беларуская мова была афіцыйна забароненай.

Жыхары Беларусі змушаныя былі пакідаць сваю краіну і ехаць у Санкт-Пецярбург ці Маскву, каб атрымаць вышэйшую адукацыю. Праз гэта іх вымушалі забываць родную мову й адмаўляцца ад спадчыны.

Каб пазьбегнуць інтэлектуальнага зьняволеньня, многія мастакі, пісьменнікі й музыкі зусім пакідалі краіну і засноўвалі зямляцтвы ў заходніх краінах, якія забясьпечвалі свабоду выяўленьня. Так, парыжская школа ў Францыі ўключала многіх мастакоў-ураджэнцаў Беларусі: Хаім Суцін, Мішэль Кікоін, Пінхус Крэмень, Сімон Сегал, Восіп Цадкін і Марк Шагал.


Многія навукоўцы спасылаюцца на тое натхненьне, якое Шагал атрымліваў з традыцыяў расейскіх сялянаў. Віцебскі селянін ніколі ня быў расейскім. Віцебск быў заснаваны ў IX ст., за 900 гадоў да захопу Беларусі Расеяй. Ён стаў адным з галоўных гарадоў славянскага племені крывічоў у межах Полацкага княства, якое запачаткавала беларускую нацыю. Віцебскі селянін жыў тут больш за 1000 гадоў, і ён быў адным з захавальнікаў беларускай спадчыны і традыцыяў: народнага мастацтва, народнай песьні, народнай мудрасьці,—праз імпэрскі царскі прыгнёт. Менавіта беларускі селянін уплываў ня толькі на Шагала, але і на Казіміра Малевіча ў ягоны дасупрэматысцкі пэрыяд, а таксама на многіх іншых мастакоў. Паводле нядаўняй статыстыкі беларусы ў наш час складаюць 80% насельніцтва Рэспублікі Беларусь. На працягу існаваньня савецкага рэжыму Віцебск быў адным з галоўных гарадоў БССР. Пасьля расейскай рэвалюцыі 1917 г. у Віцебску была заснавана мастацкая школа, якая пазьней атрымала міжнароднае прызнаньне галоўнага цэнтра сучаснага мастацтва. Марк Шагал быў вядучым членам гэтай школы на працягу пэўнага часу.

Развал Савецкага Саюза і негвалтоўнае узьнікненьне новых рэспублік зьяўляюцца беспрэцэдэнтнай зьявай за ўсю гісторыю Расеі і будуць запісаныя ў гісторыю ў гэтай якасьці. Навукоўцы ганарацца сваёй аб'ектыўнасьцю, але яны працягваюць увекавечваць расейскі міф.

Надыйшоў час для навукоўцаў узяць прыклад з расейскіх палітыкаў і прызнаць удзел ураджэнцаў Беларусі ў літаратуры, мастацтве, музыцы, спорце й навуцы ўсёдзяйсьненьнямі беларусаў.

Вэна заўсёды лічылася аўстрыйскім горадам, хоць і была адзін час пад нямецкім кіраваньнем; Нью-Дэлі заўсёды прызнавалі індыйскім горадам, хоць ён пэўны час быў пад брытанскай уладай; і Варшава заўжды лічылася польскім горадам, хаця некаторы час—якраз як і Віцебск—была пад расейскім панаваньнем.

Надышоў час для навуковай грамадзкасьці вывучыць сапраўдную геаграфію і гісторыю Усходняй Эўропы й аддаць належнае там, дзе трэба. Марк Шагал нарадзіўся ў Віцебску, горадзе, які ён успрымаў як сваю мастацкую тэму і мастацкаму развіцьцю якога ён спрыяў. Марк



Від з акна. Віцебск.

Шагал быў віцебскім мастаком, яўрэйскім мастаком, але і беларускім мастаком. Шагал пісаў: «Кожны мастак дзе-небудзь нарадзіўся, і нават калі пазьней ён адгукаецца на іншае асяродзьдзе, пэўная сутнасьць, пэўны водар яго роднай зямлі будзе заўсёды заставацца ў яго рабоце».

Паводле амэрыканскага часопіса «Byelorussian Review». Пераклад В. Сцяпанава і Зьм. Дзядзенкі (Ворша).

Вокны... Што за імі?

Ці не бывала ў вас так, што прыехаўшы ў незнаёмы горад, вы на пачатку хадзілі па вуліцах і ўглядаліся ў вокны, стараючыся здагадацца, што і хто там, за імі?

А тут яшчэ прыпомнілася: «...З гэтай пары я пачаў углядацца...»

«Вокны Амерыкі»—вось яны. Сціплая і сціслая назва шэдэўра, які нашчадкі, мабыць, назавуць цудам свету. Не вельмі вялікія па плошчы вокны-вітражы ў адным з пераходаў між заламі ў «Арт-інстытуце» ў Чыкага—адным з найвялікшых у свеце музеі выяўленчага мастацтва розных часоў і народаў. Вось яно, магчыма, завяршэнне пошукаў Марка Шагала, дзе адна толькі гармонія фарбаў незвычайна ўражвае—безліч адценняў сіняга, валошкавага, нябеснага, менавіта яго, Майстра, і толькі яго. Колер, як магніт, прываблівае, цягне позірк; вачэй не адвесці; і вось ужо бачыш знаёмыя вобразы, постаці, сілуэты... І біблейская галава асла і летуценнікі над віцебскімі вулачкамі, і аканіцы роднага дому, і ўрбаністычны рытм, у якім Віцебск зліваецца ўжо з абрысамі многіх гарадоў—і Эйфелевай вежы, і Статуі Волі... Але ж над усім гэтым—дзівосная колерная гама, сіні колер, колер вялікага блакітнага глыбокага неба. Неба, якое адно тут, над табой і тымі, хто застаўся там. Простая нечаканая думка яшчэ не супакойвае зусім, але запальвае агеньчык надзеі.

Афіцыйна сцвярджаецца, што Шагал стварыў гэты шэдэўр у гонар будучай 200-ай гадавіны Злучаных Штатаў і з павагі да тагачаснага мэра Чыкага Рычарда Дэйлі, бацькі цяперашняга мэра горада. На медным шыльдзе побач з «Вокнамі»—прозвішча і імя аўтара, гады яго нараджэння і смерці і надпіс: «Byelorussian», Гэта значыць: «З Беларусі».

І яшчэ адны вокны нечакана прыемна раскрылі тут, у Чыкага, што за імі. На вельмі ажыўленай і шматлюднай Лінкальн-авеню, у вялікай зале філіяла гарадской публічнай бібліятэкі адкрылася мастацкая выстава. У нас на Беларусі яе, пэўна, назвалі б так: «Персанальная выстава вядомага беларускага мастака і педагога Хаіма Ліўшыца з нагоды яго васьмідзесяцігоддзя».

...Потым ужо, пасля сустрэчы, ён нагадае, што нарадзіўся і вучыўся ў Віцебску, жыў на Малой Пакроўскай, зусім блізка ад таго дома Шагалаў, які захаваўся і дзе цяпер Дом-музей вялікага мастака, дзе васьмігадовым хлапчуком ён бачыў самога Марка Шагала, калі мастак Метлер насіў яму сярод іншых работ падлеткаў і яго, Хаіма Ліўшыца малюнкі... Два апошнія гады Х. Ліўшыц жыве тут, у Чыкага, куды даўно пераехалі яго дзеці і куды, нарэшце, застаўшыся ў Менску ў такія гады толькі ўдвух з жонкай Евай, прыехаў і сам мастак.

Я не бачыў яго, мабыць, гадоў дзесяць, а мо і болей. Гасцей вернісажу сустракае невысокі, але зграбны, падцягнуты, з вострым праніклівым паглядам чалавек, пра якога ніколі не скажаш, што яму за восемдзесят. Пра кожную карціну ён расказвае шчодра, прыгадвае тыя гады, калі яны пісаліся. Безумоўна, нечакана і нязвыкла бачыць тут, у кантрастна-урбаністычным па стылі Чыкага, пейзажы і нацюрморты, настраёвыя эцюды і кампазіцыі, на якіх—усё толькі беларускае, адзнакі і ўкрасы толькі гэтай зямлі. «Сланечнікі», «Лубін», «Беларуская восень», «Спарышыкі», «Сланечнікі і гладыёлусы»... Прыгожая колеравая гама, тонкі жывапіс і распрацоўка дэталяў, святло нібы ад цябе, ад таго, хто глядзіць на палатно, натуральнасць і завершанасць кампазіцыі.

За сузіральна-спакойным запрашэннем да прыгожага—роздум, напружаны глыбокі роздум,—можа, менавіта ў гэтым асаблівасць творчай манеры Х. Ліўшыца-жывапісца. Думаецца, што невыпадкова мастак выкладаў жывапіс увесь пасляваенны час, спачатку—у вучылішчы, потым—у тэатральна-мастацкім інстытуце. Сярод яго вучняў—многія вядомыя сёння мастакі, напрыклад, Міхаіл Савіцкі і Барыс Забораў (знарок называю палярныя імёны).

Адкуль усё гэта? Віцебская школа? Так, калі размець яе не фармальна. Расказваючы пра мінулае, Х. Ліўшыц падкрэслівае, што вельмі ўдзячны настаўніку малявання ў беларускай сямігодцы ў Віцебску, які перапанаў яго паступіць вучыцца ў Віцебскі мастацкі тэхнікум. У канцы дваццатых гадоў горад яшчэ дыхаў водарам той мастакоўскай кузні, дзе гартаваліся Шагал, Малевіч, Эль Лісіцкі, Юдовін, Ермалаева і іншыя сёння сусветна вядомыя таленты, дзе Ігуда Пэн быў самым высокім аўтарытэтам—і педагагічным, і эстэтычным.

Праз колькі дзён мы ўжо гутарылі з Хаімам Ліўшыцам у яго майстэрні, зноў прыгадвалі мінулае.

Я прызнаюся, што ў яго вядомай карціне "Я. Купала і К. Чорны ў Пячышчах, 1942 год" мяне ў свой час уразіў падтэкст, блізкі да спробы растлумачыць загадку смерці нашага вялікага паэта, цікаўнасць да якой потым шырылася, абрастала новымі легендамі і дакументамі, і—што вельмі важна сёння—новым сэнсавым прачытаннем многіх твораў Я. Купалы. Новая праца Х. Ліўшыца, вялікае незавершанае яшчэ палатно, што займае ўсю сцяну чыкагскай майстэрні. Кампазіцыя амаль закончана—ідзе дапрацоўка дэталяў, дробязяў, але яны заўсёды вельмі важныя для Х. Ліўшыца.

...Задума нарадзілася ў яго даўно, яшчэ ў гады вайны. На плошчы у гета іграе аркестр, музыкі—клезмер, як іх называюць на мове ідыш. На вачах ва ўсіх—роспач, туга, пакуты, роздум. Усе персанажы—у розных пластычных позах, амаль біблейскіх. Застыла на хвілю музыка, можа, на самай высокай ноце... На пярэднім плане—аўтапартрэт на ўвесь рост—сам мастак, трымаючы падсвечнікі са свечкамі, стаіць і дапытліва ўглядаецца ў таго, хто глядзіць на карціну. Вядома, ён шукае, але і пытаецца, папярэджвае. На фоне чытаецца і вясковая аколіца, і гарадскі трывожны пейзаж, і абрысы сумна вядомай менскай «ямы»—месца масавых расстрэлаў яўрэяў... Але твары ў людзей не скажоныя, гэта твары не пакутнікаў, а прыгожых людзей, у якіх вялікія душа і сэрца...

І хіба не дзіўна, што такая карціна пішацца тут, у ціхім прыгарадзе Чыкага, далёка ад тых мясцін, дзе было тое, што трывожыць і ўздзеньі ўначы, не дае спакою тут, сярод вокнаў Амерыкі, вокнаў такіх розных кантрастных, непадобных, загадкавых.

Вокны Амерыкі...

У Вашынгтоне ў тыя ж дні адбылося адкрыццё Музея Халакосту (Катастрофы)—музея памяці яўрэяў, што загінулі ў агні Другой Сусветнай вайны. На ўрачыстасць прыехалі дзяржаўныя кіраўнікі Польшчы, Ізраіля, Чэхіі, Харватыі, Балгарыі, Славеніі, Славакіі, Румыніі, Малдовы, Венгрыі, Албаніі, Партугаліі. Выступіў з прамовай і прэзідэнт ЗША Клінтан... Самая шырокая прэса, трансляцыя на ўвесь свет... Не было толькі прадстаўнікоў Беларусі...

Гісторыя, вядома, можа і не навучыць. Але пастараецца не даць схлусіць.

І пра гэта думаецца, калі ўглядаюся тут у гэтыя вокны—вокны Амерыкі.

Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ.
Чыкага, май 1993 г.



Добры дзень. Радзіма

І ЗНОЎ ПЕРАМОГА!

У нялёгкі час перабудовы няпростае становішча ў многіх працоўных калектывах, у тым ліку і ў прафесійнай пажарнай часткі Рубы. Нягледзячы на розныя пастановы Савета Міністраў ды Дзяржкампрацы, пажарнікі ўвесь час застаюцца па-за ўвагай кіраўнікоў усіх рангаў, атрымваючы жабрацкі заробак. Таму калектыву ППЧ-6 сумесна з прафкамам даводзіцца ўвесь час змагацца за выжыванне, аб чым сведчаць пратаколы пасяджэнняў, звароты ў вышэйстаячыя інстанцыі.

Поўнасцю згодзен з патрабаваннямі падначаленых начальнік УПА Віцебскага аблвыканкама А. Падліпскі, але, па яго словах, ВА «Даламіт», якое павінна ўтрымліваць пажарную частку, своечасова не выдзяляе сродкі на яе, а то і зусім адмаўляе.

На працягу года пажарнікі тройчы аб'яўлялі страйк і толькі пасля гэтага пытанне неяк вырашалася. Вось і ў траўні ў чарговы раз калектыў абвясціў перадстрайкавы стан, бо атрымлівалі той жа заробак, што і напрыканцы мінулага года. Спужаўшыся, кіраўніцтва зрабіла пераразлік са студзеня, павысіла аклады.

Ізноў перамога, але ж ці надоўга? А мо праз месяц-другі зноў усё спачатку? Дык што ж гэта за дзяржава, дзе рабочага не лічаць за чалавека?

Што за кіраўніцтва-чыноўніцтва, для якога закон—не закон?

Калі ж, нарэшце, прыятытэты чалавека стануць вышэй і даражэй інтарэсаў дзяржавы?

Палаюць лясы, там-сям пажары ў вёсках, гінуць у агні людзі... Разумеюць пажарныя, што вырашаць забастоўкамі праблемы—не найлепшы шлях. А што зробіш? Гэта—найбольшы дзейсны метад абароны сваіх правоў ад няўважлівых, грэблівых адносін да чалавека дзяржавы й прадпрыемства.

Добра, што людзі, калектыў ППЧ-6, здольныя адстойваць свае інтарэсы, бараніць працоўную ды чалавечую годнасць.

І. ВАСІЛЕЎСКІ.

P.S. Паводле атрыманай нядаўна інфармацыі, чарговая зарплата ў чэрвені зноў не выдадзена, бо «Даламіт» пералічыў толькі пятую частку ад неабходнай сумы грошай.

СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ...

Вы ніколі не задумваліся над тым, якая плошча вашай кватэры? Скажаце, што тут разважаць—ёсць адпаведныя нормы жылплошчы на аднаго чалавека. І паводле іх будуецца жыллё і выдаюцца ордэры на кватэры. Вялікая сям'я—атрымлівай прасторную шматпакаёўку. Жывеш адзін—хопіць пакоя. Здаецца, усё зразумела...

Віцяблянін К. Маляроў, што жыве па вул. Церашковай, займеў кватэру. Паводле ордэра яе метраж павінен быць 21,56 $м^2$. Але Канстанцін Пятровіч уласнаручна перамерыў новае жытло і на самой справе атрымалася... 19,95 квадратнага метра. Паўтара квадрата зніклі ў невядомым кірунку.

І што характэрна, падобныя «фокусы» з жылплошчай сустракаюцца Маляроваму не ўпершыню. На старой кватэры ён таксама знайшоў недахоп фактычнай плошчы. Работнікі домакіраўніцтва, куды звярнуўся Канстанцін Пятровіч, перамерваць жыллё адмовіліся.

Здзіўляе, што розніца паміж фактычным метражом кватэры і тым, што пазначаны ў ордэры, паказвае недахоп квадратаў паводле дакументаў. Чаму не наадварот? А можа таму, што ў дзяржавы (чытай: у чыноўнікаў сістэмы) ёсць звычка падманваць і абкрадаць? Нават у плаце за жыллё?

А. БУКАЧОЎ.

Пратэст ля помніка правадыру

21 чэрвеня ў Віцебску з дазволу мясцовых улад на плошчы Леніна прайшоў мітынг пратэсту супраць сацыяльна-эканамічнай палітыкі Вярхоўнага Савета і ўрада рэспублікі. Арганізавалі гэтае мерапрыемства афіцыйныя прафсаюзы. У мітынгу ўдзельнічалі прадстаўнікі кіраўніцтва горада і вобласці. Актыўнічалі тут камуністы, якія прыйшлі на плошчу са сцягамі былых СССР і БССР, раздавалі ў натоўпе свае выданні.

Так што назваць мерапрыемства прафсаюзным можна з вялікай нацяжкай. Хутчэй гэта была сумесная акцыя віцебскіх уладаў, абласнога кіраўніцтва афіцыйных прафсаюзаў і мясцовых камуністаў.

Чаму ж арганізатары мітынгу выбралі для яго правядзення менавіта плошчу Леніна? Можа, яны хацелі пачуць ад свайго правадыра адказ на пытанне: куды весці далей зняверанага народ? Але бронзавы Ільіч, як звычайна, маўчаў і ўсё паказваў некуды ўзнятай рукой.

«Папратэставаўшы» з гадзіну, радавыя віцябляне і іх кіраўнікі разышліся ў розныя бакі. Лішняя «пара» выпушчана з катла народнага незадавальнення. Урад і мясцовыя ўлады змаглі крышку перавесці дух. Да наступнага рэзкага скачка цэн.

А. БУКАЧОЎ.

Забараніць дзейнасць партый камуністычнага накірунку

Тое, што на Беларусі наступаюць камуністы, зразумела, здаецца, ужо кожнаму чалавеку. І наступствы будуць вельмі і вельмі цяжкія як для грамадзян, так і для дзяржавы ў цэлым. Бо нягледзячы на тое, што гучаць словы аб перайначанні шляхоў дзейнасці камуністаў, нічога мяняцца не будзе, бо немагчыма рэфармацыя партыі, у аснове ідэалогіі якой—дыктатура. Толькі зараз гэта будзе дыктатура карумпіраванай, павязанай між сабой наменклатуры, засеўшай у кіраўніцкіх крэслах.

Дыктатура, для якой няма такіх паняццяў, як закон, сумленне, здаровы сэнс, дзяржаўныя і народныя інтарэсы, чалавечая годнасць. Дыктатура, што не прызнае права чалавека на іншыя погляды.

Дэпутаты з камуністычнай фракцыі «Беларусь» часта спекулююць такімі паняццямі як «сацыялізм», «капіталізм». Але кожнаму больш-менш дасведчанаму чалавеку вядома, што сродкі вытворчасці ў нас дзяржаўныя, значыць дзяржаўны капіталізм. А зараз з лямантам «Вось дэмакраты давялі!» высокапастаўленыя і не вельмі наменклатурныя чыноўнікі з патурання Урада і Вярхоўнага Савета перацягваюць дзяржаўную маёмасць у асабістыя лапы. Такім чынам будуецца сапраўдны капіталізм. А словы «сацыялізм», «сацыяльныя заваёвы»—толькі шырма для такіх дзеячоў.

...Камуністы наступаюць. У Рубе на вежы вадакачкі ля будынка заводакіравання, дзе засеў былы першы сакратар Віцебскага абкама КПБ У. Грыгор'еў, развяваецца чырвоны сцяг... І гэта сведчыць аб тым, што іншага шляху ў іх няма. Раней з гэтага ж пачыналі. Закончылі ГУЛАГам, Афганістанам, Чарнобылем. Зараз у выпадку канчатковай перамогі «чырвона-карычневых» пад пагрозай існавання беларуская дзяржава, беларуская нацыя.

А бел-чырвона-белы дзяржаўны сцяг, які з гонарам лунаў над будынкам пасялковага Савета, зрываюць ужо каторы раз пад покрывам цемры. Старыя метады, старыя шляхі.

Таму прапаную забараніць дзейнасць партый камуністычнага накірунку.


Ігнат ВАСІЛЕЎСКІ.

Надышла пара і пары падаражэць

Даволі доўга трымалі пазіцыі цэны на білеты ў лазню. І вось першага ліпеня адступленне—павышаны ў два разы кошты на мыццё ў лазневых ды душавых аддзяленнях. Квіток туды можна атрымаць толькі за 60 рублёў. Цана за наведванне сауны (зразумела, групамі) зараз не менш 4 тысяч.

Ю. Т.

З архіваў
«Бухгалтэрыя» смерці



Помнік ахвярам гітлераўскага фашызму ў Віцебску.

Фотаздымак **А. ЛАКАТКО.**

Мы працягваем друкаваць спісы вязняў Віцебскай гарадской турмы СД. Пачатак публікацыі—у «Выбары» №№ 17—20. Спісы друкуюцца паводле дакумента «Рэгістрацыйны журнал асоб, арыштаваных СД», які вёўся на нямецкай мове і ахоплівае перыяд з чэрвеня па снежань 1942 года. Мы імкнёмся максімальна перадаць асаблівасці арыгінала.

Непаслядоўнасць дат ды недакладнасць некаторай іншай інфармацыі, якія сустракаюцца ў спісе, тлумачацца тым, што менавіта так яны пададзены ў дакуменце. У якіхсьці імёнах і прозвішчах вязняў магчымыя скажэнні ў выніку падвоенага перакладу—з рускай мовы на нямецкую і наадварот, а таксама з-за асаблівасцяў рукапіснага арыгінала.

Рэдакцыя выказвае шчырую падзяку супрацоўнікам Віцебскага абласнога архіва за дадзены дакумент.

Тетрадь № 8

Фонд 2155, опись 2, дело 5

Прибытие	Убытие	Номер арестованного	Номер камеры	Фамилия, имя	Кто доставил, арестовал
				24.6.42 г.	
	1	2288	91	Файльман Юлиус	умер
	1	1574	68	Мускулис Троф	немец. суд
	1	81	37	Возюкевич Никол.	расстрел.
1		2571	86	Ливадо Петр	СД
1		2572	86	Радкевич Никол.	СД
1		2573	12	Кахонская Мария	СД
1		2574	12	Дидюля Лидия	СД
1		2575	12	Тимунчик Лидия	СД
1		2576	15	Хаусевич Алекс.	
1		2577	15	Хаунховская Нанита	
1		2578	15	Шаурок Алекс.	
1		2579	15	Ревинский	
1		2580	15	Кац Лева	
1		2581	14	Шаторник Михаил	СД
1		2582	12	Тихарнова Анна	СД
1		2583	14	Шавловский Иоганн	СД
1		2584	14	Станкевич Леон	СД
1		2585	14	Ловкович Михаил	СД
1		2586	12	Дидюля Марфа	3 пол. участок
1		2594	12	Петуховская Елена	—»—
1		2595	14	Шехлог Иван	—»—
1		2596	27	Смирнов Николай	
1		2597	14	Шункевич Михаил	
1		2598	14	Иванов Касьян	пояснений в оригинале нет
1		2599	14	Тарашкевич Эдуард	
1		2600	14	Циравлев Владимир	
1		2601	14	Муравьев Леонид	
1		2602	14	Крастовицкий Федор	
1		2603	14	Воршитов	
	1	2070	61	Каренбаум Изя	СД
	1	2167	60	Эбстен Фома	СД
	1	955	87	Альфимович Василий	СД
	1	2233	84	Парков Якоб	СД
1		2274	99	Глатт Августин	СД
	1	1976	29	Белявский Леонид	СД
	1	2238	85	Руссов Мульс	СД
	1	2200	84	Янкелувиц Мовка	СД
	1	1514	39	Трофимова Раиса	СД
	1	1517	45	Шугалой Василий	СД
	1	1794	8	Руловина Семен	СД
	1	1958	84	Кугель Иван	СД
	1	1974	89	Ганелес Фанни	СД
	1	2013	61	Рознблюм Иван	СД
	1	1789	88	Качан Лёля	СД
	1	1965	76	Юшкевич Леонард	СД
	1	1703	88	Хахревич Фоня	СД
	1	1590	88	Рубинчук Малка	СД
	1	1867	75	Броваруй Фёдор	СД
	1	1756	91	Руляков Арфим	СД
	1	1755	88	Синько Алена	СД
	1	2402	89	Айзенкраф Мария	
	1	2312	91	Новиков Давид	СД
	1	2086	91	Амрюк Михаил	СД
	1	2085		Бхованов	СД
	1	2517	99	Чабанов Яков	СД
	1	2518	99	Чуткис Никифор	СД
	1	2506	84	Агафонов Николай	СД
	1	2507	95	Маченко	СД
	1	2508	85	Рудак Николай	СД
	1	2509	85	Твердов Николай	СД
	1	2511	86	Евшов Николай	СД
	1	2512	95	Кулев Егор	СД
	1	2513	87	Фролович Ал.	СД
	1	2510	86	Борисов Игнатий	СД
				25.6.42 г.	
	1	1797	91	Лютаревич Николай	
1		2604	14	Дедюля Иван	
1		2605	12	Шуркин Варя	СД
1		2606	15	Иванов	СД
1		2607	15	Ершов Иван	СД
	1	2473	40	Малиновская Евгения	в больницу

(Працяг у наступным нумары).

РАМАНТЫКА ЯЕ ПАРТРЭТАЎ



Як назавуць наш знявечаны час нашчадкі—прадбачыць цяжка, але прэлюдыю да яго амаль аднадушна, мы, здаецца, ацанілі як час застою. Чалавек мо так ужо скроены, што мінулае фарбуе шчодра ружовымі фарбамі, пакідаючы таму, чым валодае, больш змрочныя тоны.

«Залаты век», «Эпоха росквіту», «Часы рамантызму»...—усё гэта адрасавана таму, што было некалі, не на нашыя вочы і не на нашу памяць. Як гаварыў паэт—«Что пройдет, то будет мило...». Але гэта крытэрыі няпэўнага «рэалізму» чалавечае існасці, бо рамантычныя душы не пераводзяцца ва ўсе часы, і лепшым ды і блізкім да нас доказам і папрокам аднабаковасці, светаўспрымання нашага сучасніка ёсць творчасць маладой віцебскай мастачкі Ірыны Магучай.

Не выключана, што шаноўны чытач бачыў яе «Агні карнавалу», што экспанаваліся ў мінулым годзе ў карціннай галерэі цэнтра культуры, ці наведваў менскую «Медэю» з яе ўдзелам у адной з экспазіцый галерэі. Калі так, ён, напэўна, носіць у глыбінях душы адбіткі яе крылатых фантазіяў, аздобленых шчодрымі россыпамі зямных кветак ды ўзнеслых жаночых твараў, дзе нязгаснай надзеяй цвіце незабыўнае чаканне хараства і мары.

Вернемся ж у яе залы зноў, каб угледзецца яшчэ раз у святло вачэй яе партрэтаў, каб адчуць дыханне гордае Асобы, увасобленай у іх усхваляваных сілуэтах, каб зноў адчуць душою высокае прызначэнне чалавека, яго гатоўнасць адарыць уважлівага мастака лепшым дарам душы, затоеным святлом схаванае трапяткое існасці, якую хаваем штодня без спадзявання на павагу і зразуменне.

Так, Ірына Магучая валодае дарам здабываць узаемнасць у людзей, якіх абрала яе мастакоўская чуласць, дарам запальвацца сэрцам ад водбліскаў схаванае прыгажосці. Яе гераіні (у якасці выключэння бываюць часам і героі) раскрываюцца насустрач яе таленту лепшымі гранямі душы, як чалавек, які адчуў павеў цяпла ў сцюжу, ці промень сонца праз зледзянелы змрок, бо быць добрым і светлым—таемная прага жывое душы, якая марнее і безнадзейна звядае ад доўгога незапатрабавання. Мо таму многія хацелі б убачыць сябе ў інтэпрытацыі яе чароўнае лініі, у аздобе яе крылатае пластыкі, у шчодрым покрыве яе фантазіі аздобленай непаўторным рамантызмам фарбаў.

Часам углядаючыся ў яе аўтапартрэты (а мо мастачка падсвядома надзяляе некаторых сваіх гераінь асабістымі рысамі?) думаецца —скуль жа сама яна бярэ гэтую акрыленасць душы, якую адчувае ў другіх, як удаецца ёй, застаючыся арганічнаю часткаю нашага бяздольнага жыцця, так светла і грацыёзна несці сваё глыбокае пачуцце насустрач чалавеку, запальваючы яго сваім чароўным і стваральным святлом?

Але ж гэта ёсць неразгаданая тайна яе творчае мары, тайна мастацтва.

Алесь ПРУСКІ.

1. Надзея. 1988 г.
2. Аўтапартрэт. 1986 г.
3. Партрэт Валянціны Зышчук. 1990 г.
4. Вольга. 1991 г.







Грамада да Вялікага Сходу

Сацыял-дэмакратычная Грамада звярнулася напярэдадні з'езда беларусаў свету з прывітаннем да ягоных удзельнікаў.

БСДГ спадзяецца, што «Вялікі Сход беларусаў усёй планеты» дапаможа зразумець, дзе крыецца галоўная небяспека для дзяржаўнай незалежнасці, працэсаў рэформаў, нацыянальна-культурнага развіцця, дасць новыя надзеі й сілы для адраджэння Бацькаўшчыны.

Небяспека ёсць

Пасьля заўчаснай сьмерці Л. Кузьменкі застаецца вольнай пасада дырэктара Віцебскага краязнаўчага музея. Мясцовая намэнклятура ўзмоцнена шукае дастойных асобаў. Сярод галоўных прэтэндэнтаў —былыя супрацоўнікі Віцебскага абкама КПБ. Ёсьць небясьпека, што музэй так і ня стане асяродкам беларушчыны, а застанецца камуністычным заказьнікам.

* * *

Амаль паўгода экспануецца ў Мастацкім музэі Віцебска экспазіцыя «Русское искусство XIX ст.». Як заўсёды «высокі» клас прафэсіяналізму дэманструюць супрацоўнікі: у расейшчыну зацягнуты беларускі мастак Іван сын Фамы Хруцкі, які атрымаў мастацкую адукацыю на Беларусі, нарадзіўся і памёр на Беларусі. Віцебскія вышыванкі бісерам таксама ўключаны ў экспазіцыю са сьціплай пазнакай—«Мяйсцовая работа». Відаць, адпаведна ўяўленьню музэйшчыкаў Віцебшчына—частка Расеі. Застаецца актуальнай выснова доктара мастацтвазнаўства з Лондану Анжэя Цеханавецкага, нашага земляка: «Што тычыць прафэсійнага ўзроўню Віцебскага краязнаўчага музэя —дык іншага не чакаў» (1988 г.)

АЛЬГЕРД.

Лепш адзін раз убачыць

Даўнавата Віцебск не бачыў фотавыстаў. Не балуюць гледача мясцовыя майстры, не часта выстаўляюцца нетутэйшыя.

Пасля доўгай, так бы мовіць, фотаслепаты віцебскі аматар мастацтва нарэшце зноў стаў «відушчым». У прыватнай галерэі «У Пушкіна» адкрылася невялікая—21 праца—выстава з багатай калекцыі ганаровага сябры Аўстрыйскага саюза фотамастакоў Вальтара Кумпа, служачага з Лінца.

Больш 300 разоў у 49 краінах свету адзначаліся работы В. Кумпа, але на Беларусі, дый увогуле ва ўсіх іншых рэспубліках былога СССР, гэтая выстава—першая.

Мастак здымае ўсё. У экспазіцыі бачым і партрэт, і акт, і фота створанага чалавекам асяроддзя...

Але нашто пералічваць? Завітайце самі на выставу, якая будзе працаваць да 11 ліпеня, паглядзіце. А ў апошні дзень яе працы можаце прыйсці ў галерэю на сустрэчу з фотамастаком. А 12 гадзіне.

Назіральнік.

Рэкардсмены

Прыгажосць, як і мастацтва, патрабуе ахвяраў. Віцебскім модніцам сапраўды, мусіць, трэба многім ахвяраваць, каб пачуць апошнія «піскі» еўрапейскае моды.

Нядаўна ў кіёскі «Саюздруку» паступіла вядомая нямецкамоўная «Burda Moden», цана якой... 3724 рублі. Адразу ж за гэтым самым дарагім выданнем «крочыць» «Verena», апярэдзіўшы нават заходнія эратычныя часопісы, што прадаюцца ў кнігарнях.

Назіральнік.

Падтрымайма Свабодны прафсаюз!

Такім заклікам пачынаўся адзін з мінулагодніх зваротаў Сойму БНФ. І калі на пытанне «Як?» грунтоўнага й поўнага адказу ў віцебскіх дэмакратаў яшчэ нядаўна не было, то цяпер кожны гараджанін можа на яго адказаць.

Як? Азнаёміўшыся з матэрыяламі па працы Свабоднага прафсаюза Беларусі, якія мае рэдакцыя нашай газеты.

Званіце па нумару **37-28-44** і Вы атрымаеце інфармацыю пра СПБ.

Ю. СЯРГЕЕЎ.

Выбар

Заснавальнік

Віцебскі гарадскі клуб выбаршчыкаў «За дэмакратычныя выбары»

Галоўны рэдактар
Барыс ХАМАЙДА

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Валянцін АРЛОЎ
Хрыстафор ЖАЛЯПАЎ
Васіль ІГНАЦЕНКА
Юры ЛАЎРЭНАЎ
Ларыса МІХНЕВІЧ
Міхась ПАЎЛАЎ
Уладзімір ПЛЕШЧАНКА
Леанід ТАМАРОВІЧ
Ігар ЦІШКІН

Мастак Р. Клікушын.
Фотаздымкі М. Міхайлава.
Адрас рэдакцыі: 210601, м. Віцебск, вул. Гогаля, 17.
Тэл. 37-35-06, 37-28-44.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор ды дакладнасць пададзеных фактаў, цытатаў, гаспадарча-статыстычных даных, уласных іменаў, геаграфічных назваў і іншых звестак. А таксама за тое, што ў матэрыялах пададзены звесткі, якія з'яўляюцца дзяржаўнай ці спецыяльна ахоўваемай законам таямніцай.

Рэдакцыя можа апублікаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункт гледжання аўтара.

Пры перадруку спасылка на «Выбар» абавязковая.

Рукапісы не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца.

Бягучы рахунак рэдакцыі № 200700962 у Віцебскім камерцыйным банку (Віцкамбанк). Код (МФО) банка 150801701.

Газета набраная і надрукаваная афсетным спосабам у Віцебскай узбуйненай друкарні імя Камінтэрна: г. Віцебск, вул. Шчарбакова-Набярэжная, 6.

Выходзіць штотыднёва па сярэдах

Нумар падпісаны да друку 6.07.1993 г. у 17.15.
Наклад 1500 экз.

Цана 3 руб.